спектаклі, харавыя і сольныя спевы, танцы, выступленні чытальнікаў. Першыя вядомыя Б.в. адбыліся ў в. Пятроўшчына (гл. *Пятроўшчынскі паказ*) пад Мінскам (1906). Шырокі рэзананс атрымала *Першая беларуская вечарынка* ў Вільні (1910), у якой удзельнічалі Ф.Аляхновіч, А.Бурбіс, Ф.Мурашка, Ч.Родзевіч і інш., хор пад кіраўніцтвам Л.Рагоўскага, танц. група І.Буйніцкага. У 1910—15 Б.в. праводзіліся таксама ў Мінску, Гродне, Полацку, Слуцку, Капылі, Давыд-Гарадку (Столінскі р-н), Радашковічах (Маладзечанскі р-н), Карэлічах (гл. *Карэліцкі тэатралізаваны паказ 1912*) і інш., часта наладжваліся ў Пецярбургу, дзе ў іх прымалі ўдзел У. і К. Эпімах-Шыпілы, Цётка, П.Мядзёлка, П.Бжазінская, А.Каспяровіч, Л.Заяц, П.Тарвід і інш. (гл. *Першая беларуская вечарынка* ў Пецярбургу). Б.в., якія адбываліся ў час 1-й сусв. вайны ў Маскве, Ніжнедняпроўску (Украіна), Тамбове (Расія), мелі яшчэ і дабрачынны характар — на сабраныя сродкі аказвалася дапамога бежанцам. У час Б.в. ставіліся драм. спектаклі «Паўлінка» Я.Купалы, «Модны шляхцюк» К.Каганца, «Міхалка» Далецкіх, «Разумны і дурань» І.Карпенкі-Карага, «У зімовы вечар» і «Хам» паводле Э.Ажэшка, «Сватанне» А.Чэхава і інш., дэкламаваліся вершы Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Цёткі, А.Гаруна, Ц.Гартнага і інш. Б.в. карысталіся вял. папулярнасцю, садзейнічалі станаўленню бел. прафес. тэатра, арганізацыі новых аматарскіх гурткоў. Традыцыі Б.в. пакладзены ў аснову *Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага*.

**БЕЛАРУ́СКІЯ МУЗЫ́ЧНЫЯ ІНСТРУМЕ́НТЫ**, гл. ў арт. *Музычныя інструменты*.

**«БЕЛАРУ́СКІЯ НАРО́ДНЫЯ ПЕ́СНІ»**, шматтомны збор народных песень. Выдадзены ў 4 тамах у 1959—76 у Мінску. Укладальнік Р.Р.*Шырма*.



*Выданне «Беларускія народныя песні».*

Выданне вылучаецца жанравай разнастайнасцю прыведзенага матэрыялу, наяўнасцю рэгіянальных сюжэтаў і тыповых напеваў-формул, пашпартызацыі песень, дакладнасцю нотнага запісу, яснасцю выкладу муз. матэрыялу. У 1-ы том (1959) уключаны песні пазаабрадавыя («Смутны вечар, смутны ранак», «Жыта спее», «Дубочак зялёненькі» і інш.), баладнага характару («Учора не быў», «Ой ты, дзяўчына заручаная» і інш.), жартоўныя («Як паехаў мой міленькі», «На вуліцы грымата» і інш.). У 2-і том (1960) увайшлі песні аб жаночай долі, сіроцкія, казацкія, рэкруцкія, салдацкія, батрацкія, прымацкія і інш. У 3-м томе (1962) прыведзены песні земляробчага календара (вяснянкі, валачобныя, юраўскія, купальскія і пятроўскія, жніўныя, восеньскія, калядныя, масленічныя). Валачобныя песні характарызуюцца асаблівай паэтычнасцю і нац. адметнасцю. У купальскіх і пятроўскіх прысутнічаюць любоўныя матывы, сац.-быт. тэматыка, ярка выражаны культ сонца і агню («Ой, пойдзем, сястрыцы», «Купалёнка», «А ель мая зялёная» і інш.). Тэматыка большасці жніўных песень — цяжкая праца жанчыны ў полі, яе складанае жыццё, пры гэтым паказваецца высокі маральны дух, аптымізм, вера ў лепшую будучыню. Чацвёрты том (1976) прысвечаны вясельным песням, якія характарызуюцца прыгажосцю меласу і рытмікі («Скрыпнулі вароцейкі ў поўначы», «Сягоння ў нас вяселлейка», «Зборная суботка настае» і інш.).

*А.М.Аляхновіч.*

**БЕЛАРУ́СКІЯ НАСТА́ЎНІЦКІЯ САЮ́ЗЫ**, прафесійна-палітычныя арганізацыі беларускіх настаўнікаў у 1900—30-я гг. Аб'ядноўвалі прыхільнікаў беларусізацыі нар. асветы.

Беларускі настаўніцкі саюз. Дзейнічаў у 1907. Засн. на ўстаноўчым з'ездзе ў Вільні 25.5.1907. Ставіў за мэту рэарганізацыю сістэмы асветы на шырокіх дэмакр. асновах для ўздыму грамадзянскай самасвядомасці і культуры народа. Выступаў за свецкі характар асветы; адмену саслоўных, нац. і рэліг. абмежаванняў у сферы адукацыі; перадачу школьнай справы ў распараджэнне дэмакратычна выбраных настаўніцкіх саветаў, якія б дзейнічалі пад кантролем органаў мясц. самакіравання; перавод пачатковага навучання на бел. мову (пры захаванні вывучэння рус. і інш. мясц. моў); увядзенне бел. і інш. мясц. моў у праграмы настаўніцкіх